Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

22 СНЕЖНЯ 2018 г. СУБОТА

№ 247 (28863)

ЗВЯЗДА

Нязгаснае святло Раства

Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Раство Хрыстова 25 снежня

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас са святам Раства Хрыстова.

Яго нязгаснае святло сагравае сэрцы людзей самымі цёплымі пачуццямі.

Раство ўмацоўвае веру ў дабро. Напаўняе духоўнымі сіламі. Дапамагае спасцігнуць вечныя каштоўнасці: каханне, міласэрнасць, уменне дараваць. Сцвярджае ў грамадстве найлепшыя хрысціянскія традыцыі: шанаванне бацькоў, якія падарылі жыццё, непахіснасць сямейных повязяў, адданасць роднай зямлі.

Няхай глыбокі сэнс вялікай урачыстасці спадарожнічае ўсім вашым добрым справам і распачынанням.

Шчаслівага Раства, здароўя, міру і дабрабыту вам і вашым блізкім!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ПРАСЛАВІЛІ ІМЯ І РАДЗІМУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды і павіншаваў за працу, смелыя і рашучыя дзеянні найлепшых прадстаўнікоў сваіх прафесій. Урачыстая цырымонія прайшла ў Палацы Незалежнасці.



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў ордэнам Пашаны вядучага рэдактара галоўнага выпуску БелТА Аліну ШРУБОК.

«За кожным высокім званнем, ордэнам, медалём — гісторыя чалавека. Чалавека-стваральніка, таленавітага, працавітага, адданага сваёй справе і краіне», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што ў гэты дзень у зале сабраліся прадстаўнікі амаль усіх сфер дзейнасці, жыхары розных куткоў Беларусі.

«Але ўсіх вас аб'ядноўвае агульнае імкненне зрабіць Беларусь прыгажэйшай, багацейшай і больш паспяховай, абараніць мір і ўмацаваць наш суверэнітэт. Сваімі дасягненнямі, перамогамі, добрымі справамі вы ўвайшлі ў гісторыю адыходзячага года, у гісторыю краіны. Праславілі не толькі сваё імя, але і сваю малую і вялікую радзіму», — падкрэсліў Прэзідэнт. На думку Аляксандра Лукашэнкі, менавіта такія поспехі — прыклад сапраўднага патрыятызму, які праяўляецца менавіта ў канкрэтных справах і ўчынках.

Учора адзначылі і прадпрыемствы, якія не толькі паспяхова вырабляюць высакаякасную прадукцыю, але і адраджаюць сёлы, займаюцца дабрачыннасцю. «Мы ганарымся высокімі дасягненнямі нашых навукоўцаў, урачоў, педагогаў у навукова-даследчай, практычнай працы, а таксама вынікамі важнай для дзяржавы місіі органаў сацыяльнай аховы. Захапляемся творчымі поспехамі беларускіх дзеячаў культуры і мастацтва, дастойнымі выступленнямі і гучнымі перамогамі айчынных спартсменаў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Асаблівыя словы віншавання прагучалі ў адрас інфармагенцтва БелТА, якое адзначае вялікі юбілей — сто гадоў.

Традыцыйна ў гэты ўрачысты дзень дзякавалі прадстаўнікам сілавых структур, якія гарантуюць мір і бяспеку ў нашай краіне.

Прэзідэнт павіншаваў усіх з заслужанымі ўзнагародамі: «Упэўнены, што гэтыя ўзнагароды натхняць вас на чарговыя здзяйсненні, адкрыюць перспектывы далейшага прафесійнага росту, дадуць новыя магчымасці для творчай рэалізацыі».

Надзея АНІСОВІЧ.

Каментарый у тэму

Начальнік Мінскага аэраклуба імя двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца Добраахвотнага таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту Рэспублікі Беларусь Мікалай МАЧАНСКІ, узнагароджаны ордэнам «За асабістую мужнасць»:

— Лічу, што атрымаць ордэн «За асабістую мужнасць» у Палацы Незалежнасці з рук Прэзідэнта, — гэта ўжо вельмі высока і годна. Быў учынак, які, відаць, падштурхнуў ацаніць мае дзеянні: за 45 секундаў верталёт, які гарыць, пасадзіць на поле, не дапусціць разбурэнняў і не перавесці ўсю сітуацыю ў аварыйную. Даць магчымасць заводам-вытворцам, якія рабілі гэты новы рухавік, знайсці прычыну. Зараз яе ліквідавалі. І дарэчы, у мінулую пятніцу мы давялі праблему да канчатковага рашэння, цяпер на ім магчыма лятаць, і гэты рухавік вельмі добры, мадэль верталёта мадэрнізіравана.

Выпадак быў 6 мая, на 14-й хвіліне палёту загарэлася табло на пярэдняй панэлі кабіны, потым другое табло загарэлася, дзе проціпажарная сістэма органаў кіравання паведаміла аб тым, што адбываецца пажар левага рухавіка. Далей дзейнічаў па інструкцыі і па дакументах, якія напісаны, як лётчыкі кажуць, крывёю. Выключыў левы рухавік, развярнуў верталёт, пайшоў на зніжэнне, падбіраю пляцоўку для пасадкі. У гэтай сітуацыі ў лётчыка ёсць секунда-паўсекунды, каб прыняць рашэнне.

Нараджэнне Любові

Фота Анатоля КІЕШЧУКА.

Маладая матуля, мінчанка Вераніка НОВІК са сваім пяцімесячным сынком Львом напярэдадні Каляд наведвае касцёл Святога Яна Хрысціцеля ў сталічным мікрараёне Серабранка.

«СПАКУСА» ЦІ РАДАСЦЬ БОЖАГА ЎЦЕЛАЎЛЕННЯ

Пастырскае пасланне архіепіскапа Тадэвуша Кандрусевіча на Божае Нараджэнне 2018

Глыбокапаважаныя святары, кансекраваныя асобы, браты і сёстры, людзі добрай волі!

Сардэчна вітаю вас у радаснае і збаўчае свята Божага Нараджэння, калі мы адзначаем прыйсце Бога ў чалавечым целе ў наш грэшны свет з мэтай яго збавіць. Гэтая падзея, якая мела месца дваццаць стагоддзяў таму, стала паваротным пунктам у гісторыі чалавецтва. Яна адкрыла яму новы далягляд і дала новую надзею, нават насуперак надзеі (Рым 4, 18).

Евангелле прадстаўляе праўду ўцелаўлення Бога, якая нас зачароўвае. Перад абліччам Божага Немаўляці яна нас абяззбройвае і схіляе да разважання над бязмежнасцю Божай любові да грэшнага чалавека. Бог не пакінуў чалавека аднаго з яго бядой, але паспяшаўся яму на дапамогу. На гэтую ласку бязмежнай любові Бога да чалавека мы таксама пакліканы адказаць узаемнай любоўю да Бога.

Змяняюцца часы і звычаі, але праўда Божага Нараджэння застаецца нязменнай. Яна заклікае нас да таго, каб Бог праз

сваю ласку нараджаўся ў нашых сэрцах і праз нас — у свеце, які ўсё больш адыходзіць ад Бога і мае патрэбу ў новым подыху Духа.

Мы ведаем, што існуюць вялікія і нават істотныя адрозненні паміж рэлігіямі і веравызнаннямі, хоць цяпер нярэдка можна пачуць ідэі сінкрэтызму, які сцвярджае, што ўсе рэлігіі роўныя. Дастаткова толькі верыць, каб быць збаўленым, і не важна, у якога бога.

Такое меркаванне фальшывае. Калі ўсе рэлігіі вызнаюць веру ў існаванне бога, то хрысціянства адкрывае значна больш: а менавіта, што Бог стаў чалавекам для нашага збаўлення. Таму хрысціянства — гэта вера не толькі ў Бога, але ў Бога-Чалавека Езуса Хрыста, нашага Збаўцу, Нараджэнне якога мы сёння адзначаем.

Вера ў боскасць і чалавечасць Езуса Хрыста з'яўляецца падмуркам нашага аптымізму. Мы верым у Бога і ў той жа час верым, што Сын Божы прыняў чалавечае цела, а гэта азначае, што разам з Ім Божая ласка прыходзіць у наш бачны свет, у нашую працу, у нашае асяроддзе і нашае жыццё. Гэтым самым хрысціянскае Аб'яўленне «абагаўляе» зямлю.

СТАР. 3

Перадсвяточнае

Настрой з водарам лесу

Дзе і як вырошчваюць галоўны навагодні атрыбут

Днямі па ўсёй краіне запрацавалі ёлачныя базары. Карэспандэнт «Звязды» даведалася, які шлях праходзіць кожнае дрэўца перад тым, як трапляе да пакупнікоў.

Мадэльныя параметры калючых прыгажунь

«Што было найперш — ёлка ці шышка?» — любімае жартаўліва-філасофскае пытанне леснікоў у канцы снежня. Менавіта з яго пачалася мая экскурсія па тэрыторыі Стаўбцоўскага лясгаса.

— Дакладнага адказу вам ніхто не дасць, — з усмешкай кажа **начальнік пастаяннага гадавальніка Валянціна САХАР.** — Але ў вас ёсць магчымасць убачыць ялінкі, якія яшчэ два гады таму «сядзелі» ў шышках.

Мы стаім на заснежаным полі, якое на першы погляд нічым не адрозніваецца ад сельскагаспадарчых. Раптам Валянціна сыходзіць з пратаптанай сцяжынкі ўбок, прысядае і акуратна расчышчае рукою мяккі снег. Пад белым дываном — тысячы маленькіх саджанцаў вышынёй не больш за 10—15 сантыметраў.

СТАР. 11

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кіраўнік Пентагона ідзе ў адстаўку

Аб гэтым абвясціў прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. «Генерал Мэціс пойдзе на пенсію з адзнакай у канцы лютага пасля двухгадовай службы ў маёй адміністрацыі на пасадзе міністра абароны, — напісаў ён у «Твітэры». — Генерал Мэціс вельмі дапамог мне ў тым, каб прымусіць саюзнікаў і іншыя краіны плаціць сваю долю ваенных абавязацельстваў». Ліст самога Мэціса аб адстаўцы, які ён напісаў Трампу, апублікаваў тэлеканал NBC. «Я ганаруся тым прагрэсам, які быў дасягнуты за апошнія два гады па некаторых ключавых мэтах, апісаных у нашай стратэгіі па нацыянальнай абароне. Нашы войскі працягваюць паказваць неабходныя здольнасці для таго, каб атрымаць верх у канфлікце і падтрымаць моцны ўплыў ЗША ў свеце», — адзначыў ён. Мэціс падкрэсліў, што верыць ва «ўнікальную і комплексную» сістэму альянсаў. «Паколькі ў вас ёсць права мець міністра абароны, у якога погляды больш падобныя з вашымі па гэтых і іншых пытаннях, я лічу, што маю права пайсці ў адстаўку», — заўважыў кіраўнік Пентагона ў сваім лісце да Трампа.

ЕС узгадніў бюджэт Італіі

Рым і Брусель дасягнулі пагаднення па італьянскім бюджэце на 2019 год. Санкцыйных працэдур у дачыненні да Апенінскай дзяржавы не будзе. У афіцыйным лісце, накіраваным прэм'еру Італіі Джузэпэ Контэ, гаворыцца, што Еўракамісія прыняла да ведама новыя фіскальныя меры яго ўрада. «Будзем шчырыя: рашэнне не ідэальнае. Але яно дазволіць пазбегнуць працэдуры празмернага дэфіцыту. Такое рашэнне на гэтай стадыі карэктуе сур'ёзную неадпаведнасць італьянскага бюджэту Пакту стабільнасці і развіцця ЕС», — сказаў еўракамісар па пытаннях еўра і сацыяльным дыялогу Валдзіс Дамброўскіс.

Атака дронаў паралізавала работу аэрапорта Гатвік у Лондане

Два буйныя дроны паралізавалі работу лонданскага аэрапорта Гатвік на фоне масавага наплыву авіяпасажыраў у сувязі з надыходзячымі каляднымі святамі. Улады Вялікабрытаніі накіравалі сюды войскі з мэтай знайсці апаратараў беспілотных лятальных апаратаў, якія з'яўляліся побач з аэрадромам кожны раз, калі дыспетчары спрабавалі адкрыць узлётна-пасадачныя палосы, паведаміла агенцтва Reuters. Работа аэрапорта некалькі разоў аднаўлялася, але потым цалкам спынілася, і ўсе авіярэйсы, якія накіроўваліся ў Гатвік, перанакіроўваліся ў іншыя аэрапорты. Усяго дроны з'яўляліся над аэрапортам каля 50 разоў. Увечары чацвярга ў будынку аэрапорта з-за адмены рэйсаў сабралася больш за 120 тысяч чалавек. Пры гэтым паліцыя не разглядае з'яўленне дронаў у аэрапорце як тэрарыстычную атаку. «Сённяшняя ацэнка заключаецца ў тым, што мы не будзем выкарыстоўваць агнястрэльную зброю», — заявіў з гэтай нагоды прадстаўнік праваахоўных органаў Джэйсан Цінглі. Пры гэтым ён папярэдзіў, што сітуацыя можа быць перагледжана. У дапамогу паліцыі ў аэрапорт былі накіраваны ўзброеныя сілы Вялікабрытаніі. «Мы там для таго, каб дапамагчы і зрабіць усё, што ў нашых сілах», — растлумачыў гэты крок кіраўнік Мінабароны краіны Гэвін Уільямсан. Прадстаўнік прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Тэрэзы Мэй назваў дзеянні зламыснікаў «безадказнымі і цалкам непрымальнымі». Адміністрацыя Гатвіка ў сваім мікраблогу ў «Твітэры» папярэдзіла пасажыраў, каб яны не накіроўваліся ў аэрапорт, не атрымаўшы апавяшчэння авіякампаніі аб тым, што рэйсы будуць адноўленыя. «Мы падзяляем расчараванне пасажыраў і ўдзячныя за іх цярпенне», — адзначалася ў заяве. Учора тэлеканал Sky News паведаміў, што ў 8.58 па мінскім часе першы рэйс прызямліўся ў аэрапорце Гатвік. Было адзначана, што ўзлётна-пасадачныя палосы адкрыты і складзены графік на вылет і прылёт абмежаванай колькасці авіярэйсаў.

Я зноў выбіраю «Звязду»

«ДЗЯКУЙ ЗА САКАВІТУЮ МОВУ І НАРОДНЫ ГУМАР»

Начальнік аддзялення паштовай сувязі Петрыкаў-2 Алена ЮРКАВЕЦ:

— «Звязда» мне падабаецца перш за ўсё сакавітай беларускай мовай. Гэта першае, што адразу ж вылучае гэтую газету сярод астатніх. Мне вельмі імпануюць падборкі народнага гумару, якія стала друкуюцца ў газеце. Атрымліваецца, што не толькі карэспандэнты «Звязды» шчыруюць для чытачоў, але і самі чытачы дзеляцца пачутым, перажытым, убачаным. Ваша выданне шмат увагі прысвячае тэме гісторыі, этнаграфіі беларусаў. І гэта правільна, бо каму, як не «Звяздзе», гэта рабіць?

Хочацца пажадаць, каб у газеце ўсе палосы сталі каляровымі — ад гэтага якасць фотаздымкаў толькі выйграе. Напрыклад, «Фота на трынаццатай» гэта толькі пацвярджае.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!